УДК 343.721

***П. А. Капіца***
*старшы следчы Ленінскага (г. Мінска) раённага аддзела*
*Следчага камітэта Рэспублікі Беларусь*

# АБ НЕАБХОДНАСЦІ РАСПРАЦОЎКІ КРЫТЭРЫЯЎ АДРОЗНЕННЯ ГАСПАДАРЧА-ПРАВАВОГА ДЭЛІКТА АД МАХЛЯРСТВА ПРЫ НЕВЫКАНАННІ АБАВЯЗКАЎ ПА ДАГАВОРАХ АБ СТВАРЭННІ І ЎДАСКАНАЛЕННІ ПРАГРАМНЫХ ПРАДУКТАЎ

У Рэспубліцы Беларусь высокія тэхналогіі актыўна ўкараняюцца ў дзейнасць грамадства, дзяржаўных органаў і арганізацый. На самым высокім узроўні ўзяты курс на пабудаванне IT-краіны [1]. Суб’ектам гаспадарання патрабуюцца камп’ютарныя праграмы, звязаныя з вытворчасцю тавараў і паслуг, маркетынгам, аўтаматызацыяй працэсаў кіравання персаналам і інш. У сувязі з гэтым існуе рызыка ўчынення махлярстваў недобрасумленнымі выканаўцамі па заключаных дагаворах аб распрацоўцы і ўдасканаленні камп’ютарных праграм. Аб значнасці дадзенай праблемы сведчаць аб’ёмы грашовых сродкаў, якія выдаткуюцца арганізацыямі на інфарматызацыю. Напрыклад, 16.11.2019 г. ДУ «І.» размясціла заяўку аб правядзенні дзяржаўнай закупкі па распрацоўцы алгарытмаў і праграмнага забеспячэння на суму 294 000 рублёў [2]. РУП «Г.» 24.12.2019 г. распачало працэдуру закупкі па аўтаматызацыі кадравага ўліку на прадпрыемстве на суму 200 000 рублёў [3]. Калі дапусціць, што ўзгаданымі грашовымі сродкамі шляхам падману завалодаюць недобрасумленныя выканаўцы, то гаворка можа ісці аб учыненні злачынстваў, прадугледжаных ч. 4 арт. 209 КК Рэспублікі Беларусь. Грамадская небяспека раскраданняў у галіне інфарматызацыі заключаецца ў канчатковым выніку не толькі ў завалоданні злачынцамі значнымі грашовымі сродкамі, але і ў запаволенні развіцця высокіх тэхналогій у краіне, што стварае пагрозу яе інфармацыйнай бяспецы, пагрозу адставання Беларусі ад перадавых краін свету.

Перад праваахоўнымі органамі стаяць важныя задачы па выяўленні, раскрыцці, расследаванні і прафілактыцы махлярстваў у IT-сферы. У гэтай сувязі на першы план выходзяць праблемы кваліфікацыі дзеянняў недобрасумленных выканаўцаў па дагаворах аб распрацоўцы і ўдасканаленні праграмных прадуктаў. Нават пры даказанасці факта

невыканання або (што яшчэ складаней) неналежнага выканання абавязацельстваў па дагаворах узнікае задача адрозніць гаспадарча-прававы (грамадзянска-прававы) дэлікт ад злачыннай дзейнасці.

Дакладных крытэрыяў адрознення заканадаўства не змяшчае. Аднак пастановай Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь № 15 ад 21.12.2001 г. «Аб прымяненні судамі крымінальнага заканадаўства па справах аб раскраданнях маёмасці» вызначана агульнае правіла кваліфікацыі: «Атрыманне маёмасці пад умовай выканання якогасьці абавязацельства можа быць кваліфікавана як махлярства толькі ў тым выпадку, калі вінаваты яшчэ ў момант завалодання гэтай маёмасцю меў мэту яе прысваення і не меў намеру выканаць прынятае абавязацельства» [4]. Таму адной з асноўных задач расследавання па справах аб махлярствах у галіне інфарматызацыі з’яўляецца збор доказаў, якія пацвярджаюць або абвяргаюць намер падазронага на невыкананне (неналежнае выкананне) прынятых абавязацельстваў на момант пачатку праваадносін з заказчыкам.

У навуковай літаратуры па праблематыцы адрознення махлярстваў ад грамадзянска-прававых (гаспадарча-прававых) дэліктаў можна адзначыць працы такіх аўтараў, як Р. Б. Асокін [5], К. М. Бархатава [6], І. А. Кісялёва [7], А. Я. Кузьмін [8] і інш. Узгаданыя даследаванні вартыя ўвагі, аднак яны праводзіліся без уліку асаблівасцей інфарматызацыйнай сферы, якія вызначаюць неабходнасць распрацоўкі крытэрыяў адрознення прымяняльна да махлярстваў менавіта дадзенага віду.

Уяўляецца, што з улікам патрабаванняў узгаданай пастановы Пленума Вярхоўнага Суда Рэспублікі Беларусь, а таксама спецыфікі праваадносін у галіне інфарматызацыі пры дэталёвай навуковай распрацоўцы крытэрыяў адрознення махлярстваў ад гаспадарча-прававога правапарушэння пры невыкананні (неналежным выкананні) абавязацельстваў па распрацоўцы камп’ютарных праграм неабходна звяртаць увагу на два аспекты, якія затым можна выкарыстаць для класіфікацыі крытэрыяў: тэхнічны і арганізацыйна-прававы. Першы вызначае наяўнасць апаратна-праграмнай магчымасці ў выканаўцы распрацаваць неабходны праграмны прадукт. Таксама гэты аспект датычыць ацэнкі розных форс-мажорных акалічнасцей, незалежных ад волі выканаўцы, на якія ён можа спасылацца, абгунтоўваючы факт невыканання (неналежнага выканання) абавязацельстваў. Арганізацыйна-прававы аспект мае дачыненне да вядомых акалічнасцей праваадносін, непасрэдна не звязаных з праграмаваннем. Сюды

адносяцца звесткі аб структуры і штаце выканаўцы, субпадрадчыкаў, наяўнасці іншых фактаў невыканання абавязкаў і інш.

Такім чынам, вызначэнне крытэрыяў адрознення гаспадарча-прававых дэліктаў ад махлярстваў пры невыкананні (неналежным выкананні) абавязкаў па дагаворах аб распрацоўцы праграмных прадуктаў з’яўляецца ў цяперашні час актуальнай праблемай і патрабуе далейшай навуковай распрацоўкі. Безумоўна, гэтыя крытэрыі будуць насіць характар пэўных арыенціраў. Іх нельга будзе выкарыстоўваць «шаблонна» прымяняльна да кожнага рашэння аб узбуджэнні крымінальнай справы або прад’яўленні абвінавачання. Пры ацэнцы сабраных падчас праверкі (расследавання) матэрыялаў неабходны індывідуальны падыход з улікам асаблівасцей суб’ектаў прававадносін, спецыфікі патрабаванняў да праграмнага забеспячэння і інш. Аднак выкарыстанне крытэрыяў адрознення не толькі спросціць працэс кваліфікацыі супрацьпраўных дзеянняў, але і дазволіць накіраваць расследаванне на збор неабходных для прыняцця законных і абгрунтаваных рашэнняў доказаў.

**Спіс асноўных крыніц**

1. Совещание по проекту Декрета «О развитии цифровой экономики» [Электронный ресурс] // Официальный Интернет-портал Президента Республики Беларусь. — Режим доступа: http://president.gov.by/ru/news_ru/view/soveschanie-po-proektu-dekreta-o-razvitii-tsifrovoj-ekonomiki-17630/. — Дата доступа: 08.01.2020. Вернуться к статье

2. Просмотр открытого конкурса (в электронном виде) auc0000019820 [Электронный ресурс] // Национальный центр маркетинга. — Режим доступа: http://goszakupki.by/etrade/view/19820. — Дата доступа: 09.01.2020. Вернуться к статье

3. Процедура закупки № 2019-770951 [Электронный ресурс] // Internet Centre of Electronic Trade. — Режим доступа: http://www.icetrade.by/tenders/all/view/770951. — Дата доступа: 09.01.2020. Вернуться к статье

4. О применении судами уголовного законодательства по делам о хищениях имущества [Электронный ресурс] : постановление Пленума Верховного Суда Респ. Беларусь, 21 дек. 2001 г., № 15 : в ред. постановления Пленума Верховного Суда Респ. Беларусь от 31.03.2016 № 2 // КонсультантПлюс. Беларусь / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2020. Вернуться к статье

5. Осокин, Р. Б. Некоторые проблемы отграничения мошенничества от смежных с ним составов преступлений и гражданско-правовых деликтов / Р. Б. Осокин // Некоторые аспекты правоохранительной деятельности в современных условиях. — 2001. — № 4. — С. 24–27. Вернуться к статье

6. Бархатова, Е. Н. Вопросы отграничения мошенничества в сфере предпринимательства от гражданско-правовых деликтов / Е. Н. Бархатова // Уголовный закон Российской Федерации: проблемы правоприменения и перспективы совершенствования : всероссийская науч.-практ. конф., Иркутск, 25 апр.

2019 г. : тез. докл. / Восточно-Сибирский ин-т М-ва внутр. дел Рос. Федерации ; под ред. О. П. Грибунова. — Иркутск, 2019. — С. 6–11. Вернуться к статье

7. Киселева, И. А. Критерии разраничения мошенничества в сфере предпринимательской деятельности и гражданско-правового деликта / И. А. Киселева // Вестн. Нижегородского ун-та им. Н. И. Лобачевского. — 2013. — № 3. — С. 87–90. Вернуться к статье

8. Кузьмин, А. Е. Некоторые проблемы отграничения мошенничества от гражданско-правовых деликтов / А. Е. Кузьмин // Вестн. молодого ученого Кузбасского ин-та : сб. ст. / Кузбасский ин-т ФСИН Рос. Федерации. — Новокузнецк, 2017. — С. 59–63. Вернуться к статье